Октябрьская революция 1917 г. оказалась попыткой леворадикального «уклонения» от военно-диктаторского режима [7, с. 16. 83].

В конечном итоге Октябрьская революция 1917 г. стала главным событием XX в. потому, что именно она в решающей мере определила тот постиндустриальный, информационный облик современного мира, который мы знаем и видим. Главный итог революции – народные массы пришли в движение во всем мире. Революция расшевелила всех.

### Использованная литература


1. Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т. 26.
2. Безелянский Ю. Отец русского марксизма // Наука и жизнь. – 2010. – № 3. – С. 67–73.
3. Политическое завещание Г.В. Плеханова. Приложение к газете «Хранить вечно» // Независимая Газета. 30.11.1999.
4. Изгоев А. С. Наши политические партии. – Петроград, 1917.
5. Бердяев Н. Истоки и смысл русского коммунизма. – М., 1990.
6. Керенский А.Ф. Интервью г-те «Интернешнл геральд трибьюн». 23 августа 1968 г. // Буржуазные идеологи о 50-летии Советской власти. Вып. 2. – М., 1968.
7. Октябрь 1917: величайшее событие века или социальная катастрофа? / Под ред. П.В. Волобуева. – М.: Политиздат, 1991.
8. Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т. 36.
9. Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т. 27.


## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ПАД УЗДЗЕЯННЕМ РЭВАЛЮЦЫЙ 1917 Г. І АДНОСІНЫ ДА ЯЕ ГЕРМАНІІ І САВЕЦКАЙ РАСІІ


Саракавік І. А.

г. Мінск, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь


XX стагоддзе ў свядомасці сучасніка ўвайшло ў гісторыю такімі важнейшымі падзеямі, як Першая і Другая сусветныя войны, знікненне з карты свету Расійскай імперыі і ўтварэнне на яе аснове Савецкага Саюза, а затым і распад СССР. Асабліва значымай падзеяй для народаў пострасійскай імперыі з'явіліся Лютаўская і

Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. Яны актывізавалі імкненні народаў, у тым ліку і беларускага, да сваёй дзяржаўнасці.

Працэс гэты пачаўся раней. Асаблівасцямі беларускага нацыянальнага руху ў пачатку ХХ ст. стала тое, што ён, у адрозненне ад рухаў іншых народаў, развіваўся пад кіраўніцтвам адной партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады; па характару ў асноўным быў сялянскім, народніцкім; меў адносна слабую матэрыяльна-фінансавую базу; на яго ўздзейнічалі такія сілы, як урадавы чарнасоценна-акцябрысцкі блок, польскія шляхецка-клерыкальныя групоўкі [18, с. 435].

Характэрна, што да Першай сусветнай вайны дзяржаўнасць прадстаўлялася ў выглядзе аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі. Яна выказвалася прадстаўнікамі як уплывовых колаў (памешчыкам Р.А. Скірмунтам, прысяжным паверанам А.Р. Лядніцкім, князем Г. Друцкім-Любецкім, ксяндзом Ф.С. Трасуном, баронам Э.Ю. Ропам і інш.), так і левых партый на чале з сацыялістам А. Луцкевічам, хаця яны былі падзелены сацыяльна-эканамічнымі і духоўнымі бар’ерамі [6, с. 316–327].

Ведаючы пазіцыю Расіі і намеры Германіі, кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху імкнуліся адраджэння Вялікага Княства Літоўскага ў выглядзе канфедэрацыі Беларусі і Літвы. 15 снежня 1915 г. у Вільні быў надрукаваны ўніверсал аб утварэнні ВКЛ з раўнапраўных частак – Літвы і Беларусі. У лютым 1916 г. у адозве Рады канфедэрацыі да грамадзян была выкладзена дзяржаўная платформа. У ёй гаварылася, што, па-першае, літоўскія і беларускія землі павінны былі ўтварыць дзяржаўную цэласнасць з адным соймам у Вільні. Па-другое, у склад Беларуска-Літоўскай дзяржавы ўваходзілі ўсе акругі, занятыя нямецкімі войскамі, – Ковенская, Віленская, Гродзенская і Сувалкаўская, літоўскія часткі Курляндыі, а таксама часткі Мінскай губерні; усім нацыям на гэтых землях забяспечваліся поўныя правы. Па-трэцяе, неабходна было сабраць Устаноўчы сойм у Вільні з мэтаю распрацоўкі канстытуцыі новай дзяржавы [1, с. 32–34]. Аднак гэта ідэя не была рэалізавана з-за пазіцый літоўцаў, палякаў, немцаў. Літоўцы баяліся, што ў супольнай дзяржаве, як малы народ, будуць залежаць ад беларускай дамінацыі. Палякі хацелі аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. і таму разглядалі Беларусь па-ранейшаму як «крэсы всходні». Немцы прытрымліваліся стратэгічнай задачы – аслабіць царскую Расію,

вывесці яе з вайны. Беларускія землі разглядалі як сродак дасягнення мэты – імі можна было гандляваць.

У гады Першай сусветнай вайны дзяржаўнасць беларускага народа ў многім залежыла ад пазіцый Германіі і Расіі. Немцы захапілі прыкладна 25% тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам звыш 2 млн чалавек. Стаўленне нямецкай палітычнай эліты да яе не было адназначным, існавала некалькі праектаў. Паводле першага меркавалася занятыя землі далучыць непасрэдна да Германіі. Аўтары другога прапаноўвалі з расійскай і аўстрыйскай частак Польшчы стварыць самастойную польскую дзяржаву пад пратэктаратам Аўстрыі. Трэці праект, падтрыманы Галоўным ваенным камандаваннем, прадугледжваў прыняцце канкрэтнага рашэння, зыходзячы з ходу ваенных дзеянняў. Менавіта ён і быў прыняты. У адпаведнасці з апошнім праектам Германія і праводзіла сваю палітыку на ўсходзе. 5 лістапада 1916 г. Германія і Аўстра-Венгрыя аднавілі Польскае каралеўства ў існуючых раней межах як незалежную дзяржаву з манархічна-канстытуцыйным ладам [15, с. 8].

Галоўнай жа мэтай нямецкага камандавання было вывесці Расію з вайны, захаваць яе як эканамічнага партнёра з яе вялізным унутраным рынкам, дабіцца ад яе пэўных уступак. З мэтай аслаблення царскай Расіі і ўмацавання свайго тылу нямецкае камандаванне дазволіла ўтварыць у Вільні Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый на чале з Беларускім народным камітэтам (БНК) – каардынацыйным органам беларускіх палітычных, грамадскіх і прафесійных арганізацый [27, с. 18]. Палітычная дзейнасць яго была скіравана на ўтварэнне Беларуска-Літоўскай дзяржавы з унутраным размежаваннем «аўтаномных Беларускай і Літоўскай зямель паводле матчынай мовы жыхароў» [28, с. 438].

Па другі бок фронту на беларускай этнічнай тэрыторыі размяшчаліся расійскія арміі. Беларускія гарады, мястэчкі і вёскі прыкметна папоўніліся расійскімі войскамі і іх тылавымі службамі. У прыфрантавой паласе сабралася больш за мільён бежанцаў з Польшчы і заходніх раёнаў Беларусі [2, с. 577]. Адносіны царскай Расіі да Беларусі ў час вайны не змяніліся: не прызнала афіцыйнай беларускую мову, не дазваляла ствараць нацыянальныя арганізацыі; па-ранейшаму прытрымлівалася пазіцыі адзінай і недзялімай

імперыі. Такі ж падыход меў і Часовы ўрад. На яго думку, тэрытарыяльная праблема будучай Расіі павінна была вырашацца Усерасійскім устаноўчым сходам.

На гэты час у Беларусі існавалі розныя падыходы адносна яе дзяржаўнасці. На захадзе і ў цэнтры пераважалі незалежніцкія настроі, на ўсходзе схіляліся да федэратыўнай сувязі з дэмакратычнай рэспубліканскай Расіяй у форме абласной аўтаноміі ці аўтаномнага краю. Пытанне аб дзяржаўнай незалежнасці не ставілася.

Скарыстаўшыся шэрагам унутраных і знешніх прычын у Расіі, а таксама папулісцкімі лозунгамі, паўваеннай пабудовы сваёй арганізацыі бальшавікі змаглі ў Кастрычніку ўзяць уладу ў свае рукі. На погляд жа Г.В. Пляханава, яе рабочы клас быў малалікім, каля 2,5% усяго насельніцтва [19, с. 33], і не падрыхтаваны для ўзяцця палітычнай улады. І таму, «несвоечасова захапіўшы палітычную ўладу, рускі пралетарыят не зробіць сацыяльную рэвалюцыю, а толькі выкліча грамадзянскую вайну» [22, с. 105].

З пункту гледжання марксізму ў Беларусі абсалютна не існавала аб’ектыўных і суб’ектыўных умоў для сацыялістычнай рэвалюцыі. Індустрыялізацыя адсутнічала. Рабочы клас быў малалікім. Бальшавікі тут не мелі дастатковай сацыяльнай апоры. Тым не менш, 25 кастрычніка быў утвораны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, 26 лістапада – Абласны выканкам Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту.

У выніку Беларусь апынулася перад выбарам: ісці па шляху нацыянал-дэмакратычнаму ці па бальшавіцкаму. Справа ў тым, што яшчэ 25-27 сакавіка 1917 г. з’езд беларускіх партый і арганізацый прыняў рашэнне ўтварыць Беларускую краёвую раду і яе выканаўчы орган – Беларускі нацыянальны камітэт і дабівацца дзяржаўна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў складзе фэдэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі Расіі. Другі падобны з’езд у Мінску 8-12 ліпеня 1917 г. перайменаваў БНК у Цэнтральную раду беларускіх арганізацый і партый, якая ў сваю чаргу 15-20 верасня была пераўтворана ў Вялікую беларускую раду (ВБР) [24, с. 232–235]. Улічваючы кастрычніцкі пераварот бальшавікоў, 27 кастрычніка 1917 г. ВБР выдала Грамату да беларускага народа аб недапушчэнні бязладдзя на тэрыторыі Беларусі, а 15 лістапада – адозву, у якой прапаноўвалася заключыць мір з Германіяй,

аб’яднаць Беларусь, утварыць дэмакратычную рэспубліку, злучаную з Вялікарасіяй, суседнімі рэспублікамі на аснове фэдэрацыі, перадаць сялянам зямлю, утварыць беларускае войска, правесці 5 снежня 1917 г. у Мінску з’езд прадстаўнікоў беларускага народа для вызначэння яго будучыні [23, с. 241].

Каб перахапіць ініцыятыву ВБР, бальшавікі праз Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК) прынялі Дэкларацыю, ухваленую Леніным і Сталіным, аб скліканні 15 снежня 1917 г. у Рагачове надзвычайнага беларускага з’езда для ўтварэння аўтаномнай Беларусі як часткі Расійскай рэспублікі. Паколькі арганізацыйна яны не паспявалі гэта ажыццявіць, то вырашылі далучыцца да правядзення з’езда ў Мінску і на ім “раскалоць” з’езд, схіліць прысутных да прыняцця свайго рашэння.

На з’ездзе выявіліся чатыры асноўныя падыходы да дзяржаўнасці Беларусі: незалежнасць у рэспубліканскай форме, абласны статус у складзе Расіі, аўтаномны статус са сваёй адміністрацыяй і Краёвай радай, асімілятарскі падыход. Калі большасць дэлегатаў не падтрымала прапанову БАК, у ноч з 17 на 18 снежня па загаду Аблвыкамзаха з’езд быў распушчаны, а прэзідыум – арыштаваны [16, с. 185-187]. Выканкам Рады імкнуўся ўстанавіць сувязь з СНК РСФСР, але не знайшоў там паразумення. Сталін у студзені 1918 г. на III Усерасійскім з’ездзе рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў назваў яго «з’ездам памешчыкаў» [9, с. 69].

8 лютага 1918 г. Германія на перамовах у Брэст-Літоўску аб’явіла ультыматум Расіі. Ленін вымушаны быў пагадзіцца з германскімі ўмовамі міру, а Л.Д. Троцкі адмовіўся [10, с. 340]. Тады 18 лютага 1918 г. немцы пачалі наступленне па ўсяму фронту і хутка занялі Полацк, Магілёў, Гомель, Ветку.

19 лютага 1918 г. кіраўнікі Аблвыкамзаха пераехалі ў Смаленск. Уладу ў Мінску ўзяў Выканкам Рады Усебеларускага з’езда. 21 лютага ён прыняў 1-ю Устаўную грамату да народаў Беларусі і сфарміраваў урад – Народны Сакратарыят, але беларускую дзяржаўнасць не абвясціў. 22 лютага немцы ўвайшлі ў Мінск, не прызналі Народны Сакратарыят. Толькі ў чэрвені паміж нямецкай акупацыйнай уладаю і ўрадам БНР была дасягнута пэўная згода [25, с. 385].

3 сакавіка 1918 г. сепаратны мірны дагавор быў падпісаны, 15 сакавіка ратыфікаваны надзвычайным IV Усерасійскім з'ездам Саветаў, 22 сакавіка адобраны германскім рэйхстагам і 26 сакавіка ратыфікаваны Вільгельмам II. 85% тэрыторыі Беларусі адыходзіла Германіі, 15 % – Савецкай Расіі. Паўночна-заходняя частка Беларусі назаўсёды адыходзіла да Германіі з назвай «Новая Усходняя Прусія». У дагаворы ўказвалася, што «Россия отказывается от всякого вмешательства во внутренние дела этих областей» і што «Германия готова, как только будет заключен всеобщий мир и проведена полностью русская демобилизация, очистить территорию, лежащую восточнее» «Новай Усходняй Прусіі» [17, с. 53–54]. Так тэрыторыя беларусаў была падзелена на тры часткі: заходняя з Вільняй непасрэдна далучалася да Германіі, цэнтральная лічылася часова акупіраванай немцамі, усходняя заставалася ў складзе Савецкай Расіі. Германія не была зацікаўлена ў прызнанні незалежнасці Беларусі, бо, з аднаго боку, уключала ў свой склад яе паўночна-заходнія землі, а з другога – разглядала Беларусь як зручны мост для барацьбы з бальшавізмам. У адрозненне ад цывільнай улады нямецкае ваеннае камандаванне не было зацікаўлена ў перадачы беларускай тэрыторыі бальшавікам, бо апошнія ў ваенна-стратэгічным плане атрымлівалі зручны выступ. 23 сакавіка 1918 г. Вільгельм II выдаў дэкларацыю аб прызнанні незалежнасці Літоўскай дзяржавы, у склад якой былі ўключаны і беларускія землі (Віленшчына, Гродзеншчына, Беласточчына).

Толькі пасля ратыфікацыі бакамі Брэст-Літоўскага дагавора 18 сакавіка 1918 г. Рада Усебеларускага з'езда была пераўтворана ў Раду БНР, шэсць членаў Віленскай Беларускай рады былі кааптаваны ў склад рады БНР. 25 сакавіка 1918 г. яна выдала 3-ю Устаўную грамату аб дзяржаўнай незалежнасці БНР [20, с. 213]. У ёй заяўлялася, што ўрад БНР «мае ўвайсьці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзець тую часьціну Берасьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі» [3, с. 213]. Пры ажыццяўленні гэтай прапановы Беларусь стала б суб'ектам міжнароднага права, БНР была б прызнана як дзяржава. Аднак па віне Савецкай Расіі і Германіі гэтага не адбылося. РСФСР, па-першае, па-ранейшаму разглядала Беларусь як сваю складаную частку і як плацдарм для экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі на

Захад. Па-другое, яна была занепакоена тым, што цэнтральныя дзяржавы могуць прызнаць дэ-юрэ БНР як незалежную дзяржаву. Менавіта пад ціскам урада РСФСР 27 жніўня 1918 г. у Берліне быў падпісаны "Русско-Германский добавочный договор к мирному договору между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой". У адпаведнасці з ім Германія павінна была перадаць РСФСР тэрыторыю Беларусі на ўсход ад ракі Бярэзіны за пэўны выкуп. Землі на захад ад гэтай ракі перадаваліся ёй па меры выканання «остальных финансовых обязательств, взятых на себя Россией». Германія абавязвалася, што «никоим образом не будет вмешиваться в отношения между Русским государством и его отдельными областями, и, следовательно, она в особенности не будет ни вызывать, ни поддерживать образование самостоятельных государственных организмов в этих областях» [23, с. 77].

Заручыўшыся падтрымкай Германіі, 29 жніўня 1918 г. СНК РСФСР выдаў Дэкрэт, якім абвясціў, што «ўсе дагаворы і акты, якія былі заключаны ўрадам былой Расійскай імперыі з урадамі Каралеўства Прускага і Аўстра-Венгерскай імперыі, што тычыліся падзелаў Польшчы, у сувязі з іх супярэчнасцю прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай правасвядомасці рускага народа, прызнаўшага за польскім народам неад'емнае права на самавызначэнне і адзінства, – адмяняюцца гэтым беспаваротна» [5, с. 250]. Значыць, юрыдычна магла аднавіцца Рэч Паспалітая. У рэальнасці гэты акт быў фікцыяй, разлічанай на знешні прапагандысцкі эфект, бо існаваў дагавор з Германіяй ад 27 жніўня 1918 г.

Зразумела, што абвяшчэнне Радаю БНР дзяржаўнай незалежнасці Беларусі 25 сакавіка 1918 г. ва ўмовах нямецкай акупацыі хутчэй насіла дэкларатыўны характар, бо рэальная ўлада належала нямецкаму камандаванню 10-й арміі. Акупацыйныя ўлады, як у свой час Часовы ўрад, затым бальшавікі, забаранілі ўраду БНР ствараць беларускія ўзброеныя сілы, фарміраваць мясцовыя органы ўлады. Але калі ў чэрвені 1918 г. урад БНР абвясціў аб тым, што на тэрыторыі Беларусі не дзейнічалі дэкрэты і пастановы ўрада РСФСР, акупацыйныя ўлады перадалі ў веданне ўрада БНР гандаль, прамысловасць, сацыяльную апеку, асвету і культуру.

11 кастрычніка 1918 г. Рада зацвердзіла Часовую Канстытуцыю БНР. Народны Сакратарыят быў перайменаваны ў Раду народных

міністраў [25, с. 386]. Урад імкнуўся актывізаваць знешнепалітычную дзейнасць з мэтай прызнання дзяржаўнай незалежнасці Беларусі і яе непадзельнасці. Аднак у суседніх дзяржаў, а таксама Германіі былі свае стратэгічныя і тактычныя мэты, якія ў многім, больш за ўсё у тэрытарыяльных пытаннях, не супадалі з мэтамі БНР. Калі ў Германіі ў 1918 г. адбылася Лістападаўская рэвалюцыя, Вільгельм II адрокся ад прастола, а Расія дэнансавала Брэст-Літоўскі мірны дагавор, урад БНР звярнуўся да краін Антанты з просьбаю ўвесці на яе тэрыторыю міжнародныя войскі, але адказу не атрымаў.

Засталося адно: ісці на перамовы з Літоўскай Тарыбай. У выніку ва ўрадзе Літвы было ўтворана Міністэрства беларускіх спраў Літвы, пад кантроль якога перайшлі беларускія землі, раней перададзеныя Германіяй Літве. 3 снежня 1918 г. Рада і ўрад БНР пераехалі ў Вільню, а з наступленнем Чырвонай Арміі 27 снежня пераехалі ў Гродна [25, с. 387].

Такім чынам, у складаных ваенна-палітычных умовах, калі аслабла Расія, беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух дасягнуў свайго апагея – абвясціў утварэнне беларускай дзяржаўнасці ў асобе Беларускай Народнай Рэспублікі. Аднак з-за пазіцыі РСФСР, Германіі і Польшчы БНР не змагла ў поўнай меры спраўдзіцца як незалежная дзяржава. Але яна аказала істотны ўплыў на далейшы лёс беларускага этнасу.

Не маючы значнай сацыяльнай апоры ўнутры Расіі, яе бальшавікі з-за тактычных меркаванняў вымушаны былі дзеля ўтрымання сваёй улады на першым часе падтрымліваць былыя нацыянальныя ўскраіны дзяржавы. Не выпадкова СНК РСФСР ужо 2 лістапада 1917 г. у Дэкларацыі правоў народаў Расіі абвясціў роўнасць і суверэннасць усіх народаў Расіі; іх права на самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў [4, с. 40]. Аднак Ленін заяўляў, што права нацый на самвызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў будзе прадастаўляцца толькі тады, калі гэта будзе выгадна інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі.

Лістападаўская 1918 г. рэвалюцыя ў Германіі і яе капітуляцыя перад краінамі Антанты падштурхнулі бальшавікоў Расіі перамяніць свае погляды адносна заходніх земляў былой імперыі. 29 лістапада была абвешчана Эстонская ССР, 17 снежня –

Латвійская ССР, а 8 снежня – Літоўская ССР у межах, вызначаных раней Літоўскай Тарыбай. Таму ў пастанове Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (УЦВК) «Аб абласных аб'яднаннях» ад 23 снежня 1918 г. Заходняя вобласць РСФСР зацвярджалася ў складзе пяці губерняў: Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай. Віленская ўключалася ў склад Літоўскай ССР, хоць літоўцы ў ёй складалі не больш як 15-18 % насельніцтва, а ў самой Вільні – менш за 1 % [29, с. 8]. Як бачна, на заходніх межах былой імперыі бальшавікі ўтварылі нацыянальныя рэспублікі (УССР была абвешчана 12 (25) снежня 1917 г.), апрача Беларусі. Не ўпамінаецца яна і ў актах цэнтра. У пастанове УЦВК ад 13 лістапада 1918 г. аб ануляванні Брэст-Літоўскага дагавора ўказвалася, што працоўныя масы Расіі, Ліфляндыі, Эстляндыі, Польшчы, Літвы, Фінляндыі, Крыма і Каўказа, вызваленыя германскай рэвалюцыяй ад прыгнёту грабежніцкага дагавора, «призваны ныне сами решать свою судьбу» [26, с. 679–680)]. У тэлеграме І.І. Вацэцісу ад 29 лістапада 1918 г. Ленін тлумачыў: «С продвижением наших войск на запад и на Украину создаются обласные временные Советские правительства, призванные укрепить Советы на местах. Это обстоятельство имеет ту хорошую сторону, что отнимает возможность у шовинистов Украины, Литвы, Латвии, Эстляндии рассматривать движение наших частей как оккупацию и создает благоприятную атмосферу для дальнейшего продвижения наших войск» (выдзелена мной. – *І.С.*) [12, с. 234].

«Забыліся» пра Беларусь кіраўнікі Савецкай Расіі не выпадкова, тым больш што пасля таго, як Чырвоная Армія 10 снежня 1918 г. увайшла ў Мінск, старшыня Мінскага губрэўкама І.І. Рэйнгольд 13 снежня накіраваў тэлеграмы ў Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) і УЦВК аб неабходнасці ўтварэння Беларускай савецкай рэспублікі [8, с. 171]. Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК РСФСР былі вядомы і розныя падыходы да праблемы беларускай дзяржаўнасці. Кіраўнікі Заходняй вобласці наогул не прызнавалі права беларускага народа на дзяржаўнае самавызначэнне. Сакратар Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) В. Кнорын лічыў, што «белорусы не являются нацией и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты. Нашей задачей является не создание новых наций, а уничтожение старых национальных рогаток» [7]. Кіраўнікі

Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай губерняў былі супраць як існавання Заходняй вобласці, так і ўтварэння Савецкай Беларусі. Кожная губерня, на іх погляд, павінна была самастойна выходзіць на цэнтр. Беларускі нацыянальны камітэт пры Народным камісарыяце нацыянальнасцей РСФСР і беларускія камуністычныя секцыі Масквы і Петраграда выступалі за ўтварэнне Беларускай савецкай рэспублікі як складанай часткі Расійскай Федэрацыі. Пытанне аб утварэнні Савецкай Беларусі разглядалася 21–23 снежня 1918 г. на канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) у Маскве [8, с. 173]. Тым не менш кіраўніцтва РСФСР не спяшалася прымаць канчатковае рашэнне з-за змянення ваенна-палітычнага становішча. З аднаго боку, з пачаткам Лістападаўскай 1918 г. рэвалюцыі ў Германіі ў яго была надзея калі не на сусветную, то хаця б на еўрапейскую сацыялістычную рэвалюцыю. 9 лістапада 1918 г. Я. Свярдлоў, выступаючы на VIII Усерасійскім з’ездзе Саветаў гаварыў: «Я ніколі не сумняваюся ў тым, што праз паўгода мы будзем мець моцную Савецкую ўладу. Не толькі ў краінах Аўстрыі, Венгрыі і Германіі, але і ў краінах згоды – у Францыі, Англіі і Італіі». А на I Усебеларускім з’ездзе Саветаў у лютым 1919 г. ён быў яшчэ больш у гэтым перакананы: «Мы напярэдадні паўстання ў Англіі, Францыі і Амерыцы» [цыт. па: 11, с. 30]. Зразумела, што для Савецкай Расіі патрэбна было «акно» на Захад для экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі і яе ваеннай, матэрыяльнай падтрымкі. Такім «акном» і павінна была стаць Беларусь. Таму яна і не абвяшчалася як савецкая рэспубліка.

З другога боку, заходнія краіны выношвалі планы ўтварэння ўздоўж мяжы з РСФСР ад Балтыйскага да Чорнага мора шэрагу дэмакратычных дзяржаў, своеасаблівага «санітарнага кардона». Яны павінны былі не прапускаць на Захад «бальшавіцкую заразу» і весці з ёю барацьбу. Адным з першых такую ідэю выказаў 8 снежня 1918 г. англійскі пасол у Францыі лорд Берці [8, с. 160]. Тады савецкі бок з мэтай захавання сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі ўтварыў на заходняй мяжы шэраг буферных савецкіх рэспублік, якія аддзялялі РСФСР ад заходніх дзяржаў, не дазвалялі ім мець мяжу непасрэдна з Савецкай Расіяй. Яе кіраўнікі гатовы былі ісці на ўсё, каб толькі выратаваць рэвалюцыю. Ленін яшчэ 8 лютага 1918 г. пісаў: «Что выше – право наций на самоопределение или социализм? Социализм выше» [13, с. 352].

Або такая заява Леніна 18 лютага 1918 г. на пасяджэнні ЦК РСДРП(б): «Здесь говорили, что они (немцы. – *І.С.*) возьмут Лифляндию и Эстляндию, но мы можем их отдать во имя революции. Если они потребуют вывода войск из Финляндии – пожалуйста, пусть они возьмут революционную Финляндию. Если мы отдадим Финляндию, Лифляндию, Эстляндию – революция не потеряна» [14, с. 337].

Становішча зноў рэзка змянілася, калі ў адноўленай Польшчы былы член Польскай партыі сацыялістычнай Ю. Пілсудскі абвясціў аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Менавіта гэта акалічнасць прымусіла Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК Савецкай Расіі прыняць рашэнне аб утварэнні Беларускай сацыялістычнай рэспублікі і тым самым ёю, як заслонаю, закрыць РСФСР ад Польшчы. На такое рашэнне паўплывала і тое, што кіраўніцтва РСФСР баялася прызнання БНР заходнімі краінамі.

У выніку 30 снежня 1918 г. Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б) у Смаленску па загаду цэнтра прыняла рашэнне абвясціць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі (ССРБ), а саму сябе – І з’ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. У склад ССРБ з’езд уключыў Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую, Смаленскую губерні, а таксама часткі Ковенскай, Віленскай і Чарнігаўскай губерняў [20, с. 347–348]. У пераліку адсутнічала значная частка Віленскай губерні, далучанай бальшавікамі да Літоўскай ССР. 1 студзеня 1919 г. быў падпісаны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, якім абвяшчалася Беларуская савецкая незалежная рэспубліка [3, с. 219–220].

Зразумела, што дзяржаўная незалежнасць Беларусі не была поўнай. Не паспеў урад Беларусі разгарнуць працу, як 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне выдзеліць з Беларускай рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні, пакінуўшы ў яе складзе Мінскую і Гродзенскую [8, с. 182–183). ЦБ КП(б)Б не пагадзілася з гэтым рашэннем. Ленін, азнаёміўшыся з яго пазіцыяй, зазначыў: «Республика – буферная и нужна постольку, поскольку граничит с другими странами. Поскольку Смоленская, Витебская и Могилевская губерни не граничат с другими странами – постольку их можно исключить» [21, с. 92].

Гістарычная практыка паказвае, што ў вялікай палітыцы ніколі не бывае сяброў, паколькі кожны бок мае на мэце свае ўнутраныя і знешнія інтарэсы. Пад уздзеяннем знешніх фактараў, асабліва зацікаўленасці бальшавікоў Савецкай Расіі, на значнай частцы этнічнай тэрыторыі беларусаў быў сфарміраваны прывід беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Пры гэтым не трэба прыніжаць значэнне гэтага факта для беларусаў, бо ні Германія, ні Польшча ў канчатковым выніку не пайшлі нават на такі крок. У той жа час нельга ўзвялічваць гэту падзею, таму што Савецкая Расія пры ўтварэнні ССРБ кіравалася сваімі стратэгічнымі і тактычнымі інтарэсамі і ніколі не была зацікаўлена ў сапраўднай незалежнасці Беларусі, нават на савецкай аснове.

## Выкарыстаная літаратура


1. Багалейша, С.В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915 – 1924 гг. / С.В. Багалейша. – Мінск: БДАТУ, 2014. – 232 с.
2. Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995. – 800 с.
3. Вішнеўскі, А.Ф.Гісторыя дзяржавы і права Бtларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск: Акадэмія МУС Рэсп. Беларусь, 1998. – 311 с.
4. Декреты Советской власти: В 13 т. Т. 1. – М.: Политиздат, 1957. – 640 с.
5. Декреты Советской власти: в 13 т. Т. 3. – М.: Политиздат, 1964. – 664 с.
6. Запруднік, Я. Справа аўтаноміі Беларусі ў першай Думе і «Наша ніва» / Я. Запруднік // З гісторыяй на «Вы»: Арт., дак., успаміны. Вып. 3. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 351 с.
7. Звезда. – 1918. – 6 октября.
8. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 254 с.
9. Ігнаценка, І. Месца БНР у гісторыі Беларусі / І. Ігнаценка // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 1997. – 223 с.
10. История СССР с древнейших времен до наших дней: В 12 т. Т. 7. Великая Октябрьская социалистическая революция и гражданская война в СССР. 1917 – 1920 гг. – М.: Наука, 1967. – 751 с.

11. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 238 с.

12. Ленин, В.И. Телеграмма Главкому И.И. Вацетису / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. Т. 37. – С. 234.

13. Ленин, В.И. О революционной фразе / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. Т. 35. – С. 343 – 353.

14. Ленин, В.И. Речи на заседании ЦК РСДРП(б) 18 февраля 1918 г. (вечером) / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. Т. 35. – С. 336 – 338.

15. Літаратура і мастацтва. – 1990. – 13 снежня

16. Макар Краўцоў пра Ўсебеларускі з’езд // Спадчына. – 1996. – № 1.

17. Мирный договор между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой // Спадчына. – 1993. – № 2.

18. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.

19. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. – Мінск: Беларусь, 1995. – 560 с.

20. Образование СССР. Сб. документов. 1917–1924 гг.: сб. док. – М.: Изд. АН СССР, 1949. – 471 с.

21. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: док. и материалы / сост. В.Д. Селеменев (рук.) [и др.]; науч. ред. М.Ф. Шумейко. – Минск: Лимариус, 2005. – 304 с.

22. Плеханов, Г.В. Открытое письмо к петроградским рабочим / Г.В. Плеханов // Вопр. истории. – 1989. – № 12.

23. Русско-германский добавочный договор к мирному договору между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой от 27 августа 1918 г. // Спадчына. – 1993. – № 3.

24. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Мінск: Современная школа, 2009. – 456 с.

25. Сідарэвіч, А.М. Беларуская Народная Рэспубліка / А.М. Сідарэвіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі.: у 6 т. Т. 1. – Мінск: БелЭн, 1993. – 494 с.

26. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора. Сборник документов: в 2 т. – М.: Политиздат, 1968-71. – Т. 1 (1917-1918 гг.) – М.: Политиздат, 1968. – 758 с.

27. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск: Беларусь, 1993. – 236 с.

28. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1. – Мінск: БелЭн, 1993. – 494 с.

29. Юхо, Я. Фармаванне тэрыторыі беларусаў / Я. Юхо // Спадчына. – 1991. – № 6.

## 1917 ГОД В АНГЛО-РУССКОЙ ДУЭЛИ

Семёнова Л.Н. г. Минск, БНТУ

Если для исследования революций выбирается короткий период времени, например, «десять дней, которые потрясли мир» в соответствии с метафорой Джона Рида, то в поле зрения оказывается вихрь политических событий: борьба партий, течений, группировок, заговоры, выступления народных масс и смена власти, которые составляют сущность всякой политической революции. Раздвигая хронологические рамки, можно уловить биение социально-экономических тенденций, смену экономических укладов, общественного устройства, те глубинные долговременные процессы, которые с неизбежностью повышают градус и напор политического давления. На таких же глубинах формируются геополитические процессы, международный расклад сил, которые, исходя из интересов господствующих стран и их правящих групп, или усиливают, или гасят революционные трансформации. Собственно революционные волны вздымаются вполне целенаправленно именно с этих глубин, но в видимом ярком калейдоскопе политических событий, в глубину, как правило, не всматриваются. Глубинные процессы с очевидностью обнажаются в долговременной перспективе.

По прошествии ста лет становится понятным, что Русская революция 1917 г. стала драматической кульминацией в противостоянии мировой капиталистической и Русской систем в «длинном XIX» и «коротком XX» вв.